


## Надзея Парчук

# АДМЕТНАЯ КНІГА

*Денисейко А. Любовь в огне войны : Мир книги глазами читателя. Обратная связь / А. Денисейко.— Брест : Альтернатива, 2023.*

Толькі птушкі могуць ганарыцца:
Ім высока суджана ўзлятаць.
Чалавеку ж — мала нарадзіцца.
Чалавекам трэба яшчэ стаць.

*Эдуард Асадаў*

Кніга Анатоля Дзенісейкі «Любоў у агні вайны», выдадзеная ў 2014 годзе і перавыдадзеная са значнымі дапаўненнямі ў кастрычніку мінулага года ў «Альтернативе» г. Брэста, чытаецца з вялікім інтарэсам і захапленнем. А вось пісаць водгук на яе — даволі складана. Бо пра яе вельмі многа добрага і светлага ўжо напісана высокімі асобамі, знакамітымі людзьмі.

Напрыклад, Ігар Міхайлавіч Лучанок, народны артыст СССР і Беларусі, аўтар больш як 400 песень, прызнаваўся, што кніга Дзенісейкі «Любоў у агні вайны» разбудзіла ў яго ўспаміны пра апаленае вайной дзяцінства, пасляваенны час, блуканні па чужыне, вяртанне ў родныя мясціны. Кампазітар нават прысвяціў пісьменніку песню, напісаную на свае словы...

Генадзь Браніслававіч Давыдзька, заслужаны артыст Беларусі, былы старшыня Белтэлерадыёкампаніі, напісаў аўтару кнігі наступнае: «Ваша кніга зрабіла на мяне вялікае ўражанне... Праўдзівая, перапоўненая горам і болем і сагрэтая Вашым талентам, кніга вартая самай высокай ацэнкі. Я, прызнацца, даўно не чытаў такіх моцных твораў. На аснове Вашай кнігі можна стварыць не адну, а некалькі кінастужак! Яна здольная натхніць кампазітараў, мастакоў. Было б вельмі правільна перакласці кнігу на іншыя мовы, каб ніхто ў свеце не забываў, якой цаной нам дасталася перамога. Хачу асобна падкрэсліць, што кніга Ваша каштоўна не толькі з гістарычнага і патрыятычнага пункту гледжання, але і мае вялікую мастацкую вартасць. Дакументальная аснова павялічвае глыбіню пранікнення ў свядомасць і сэрца чытача».

Шмат цудоўных слоў пра кнігу сказалі заслужаны дзеяч мастацтва Рэспублікі Беларусь, аднаўляльнік крыжа Еўфрасінні Полацкай Мікалай

Пятровіч Кузьміч, пісьменнік і заслужаны журналіст Беларусі Георгій Сцяпанавіч Тамашэвіч, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Аляксандравіч Сурыкаў, кампазітар Валянцін Васільевіч Перапёлкін, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, вядомы садавод Пётр Міхайлавіч Магуйла і многа іншых знакамітых людзей, дзяржаўных дзеячаў, творчых асоб, актыўных чытачоў.

Перавыдадзеная і дапоўненая кніга набыла яшчэ большую літаратурную важкасць, адметную яркасць, ёмістасць. Творы напісаны па ўспамінах аўтара і па расповедах яго родных і знаёмых — пра нялёгкае жыццё тых, чый лёс апаліла вайна. Героі твораў не выдуманыя персанажы, не абагульненыя вобразы з псеўданімамі, а сапраўдныя людзі, са сваімі імёнамі і прозвішчамі. Сярод іх ёсць і добравядомыя ўсім знакамітыя беларусы, землякі-палешукі, а таксама і сябры, родныя і блізкія аўтару людзі.

Кніга, дапоўненая новымі матэрыяламі, атрымалася вельмі цікавай і прыцягальнай. На яе старонках — усё лепшае, чалавечнае, што характэрна беларусам. Гэта — патрыётыка і духоўнасць, гераізм і мужнасць, стойкасць і нязломнасць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, гэта паляшуцкая дабрадушнасць і міласэрнасць, працавітасць і кемлівасць, любоў да сваёй зямлі, роднага Палесся, да Беларусі.

Хочацца заўважыць, што кнігу «Любоў у агні вайны» варта было б прапанаваць школам для пазакласнага чытання. Бо важна падбіраць і прапаноўваць вучням разумныя кніжкі, з дапамогай якіх прывіваюцца высокія, прыгожыя пачуцці, гартуецца сіла духу, якія вучаць дабру і справядлівасці, міру і сяброўству, любові і вернасці, адданасці і стойкасці. Трэба каб з самага ранняга дзяцінства дзеці ўбіралі ў сваю душу і сэрца ўсё лепшае, што здабылі і зберaглі старэйшыя пакаленні, каб яны ўсведамлялі, да якіх каранёў, да якога роду яны належаць. А для гэтага мы павінны выхоўваць іх на прыкладзе добрых спраў, гераічных учынкаў, на народных традыцыях. Усё гэта ёсць у кнізе Анатоля Дзенісейкі.

Першае выданне кнігі «Любоў у агні вайны» атрымала шырокае прызнанне і вядомасць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Яно прысвячалася 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Перавыдадзеная кніга «Любоў у агні вайны», думаю, набудзе яшчэ большую папулярнасць і чытальнасць. Яна ўжо заняла вартае месца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Прэзідэнцкай бібліятэцы ў Доме ўрада, бібліятэцы Мінскай духоўнай семінарыі, у шматлікіх абласных, цэнтральных, раённых бібліятэках. Адбылося шмат прэзентацый дадзенага выдання. Анатоль Дзенісейка наведаў дзясяткі гарадскіх і сельскіх школ, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, гімназію г. Іванава, дзе правёў сустрэчы з вучнямі, навучэнцамі, студэнтамі.

Кніга Анатоля Дзенісейкі «Любоў у агні вайны» вылучана на суісканне абласной літаратурнай прэміі імя У. А. Калесніка ў намінацыі «Проза». Гэта і не дзіўна. За такі важкі духоўны скарб, як дадзенае літаратурнае выданне, пісьменнік варты высокага ўганаравання.